## § 54. Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў

**331.** Разгледзьце схему. Якія са складаных прыметнікаў утвораны спосабам асноваскладання, асноваскладання і суфіксацыі, словаскладання?

*шэр(ы)* + **-а-** + *блакітн(ы)* = *шэра-блакітны*

*бел(ы)* + **-а-** + *снег* + **-н-** = *беласнежны*

*высока* + *развіты* = *высокаразвіты*

Складаныя прыметнікі ўтвараюцца наступнымі спосабамі:
- асноваскладання (*беларуск(і)* + *руск(і)* → *беларуска-рускі*);
- асноваскладання і суфіксацыі (*кругл(ы)* + *год(□)* → *круглагадовы*);
- словаскладання (*вечна* + *зялёны* → *вечназялёны*).

**332.** Размяркуйце складаныя прыметнікі па групах у залежнасці ад спосабаў іх утварэння. Запішыце.

**Markdown**

Рознакаляровы, бела-ружовы, чужаземны, малавядомы, добрасумленны, горка-салёны, глыбокапаважаны, аднатонны, літаратурна-музычны, вышэйназваны, светла-зялёны.

Растлумачце правапіс ***-нн-*** у прыметніках.

Складаныя прыметнікі пішуцца разам, калі ўтвораны:
- ад складаных назоўнікаў, якія пішуцца разам: *вадалазны* ← *вадалаз*;
- ад словазлучэнняў: *звонкагалосы* ← *звонкі голас*, у тым ліку ад геаграфічных назваў, якія па форме з'яўляюцца словазлучэннямі: *ціхаакіянскі* ← *Ціхі акіян*;
- ад спалучэнняў слоў, што адказваюць на пытанні дзе? куды? калі? як?, з прыметнікамі: *высокаадукаваны* ← *высока* + *адукаваны*.



Правообладатель Национальный институт образования

**333.** Выпішыце са сказаў складаныя прыметнікі, пісьмова растлумачце іх правапіс.

У з о р: *ціхаплынны* ← *ціхая плынь.*

1. Толькі цяпер я заўважыў белагаловага хлопчыка, крыху меншага за Руслана *(М. Пазнякоў)*. 2. Нашы брусніцы — вечназялёная расліна: яна не скідае свайго зялёнага ўбрання і ўзімку *(Я. Сіпакоў)*. 3. Сцяг то разгараўся чырвоным полымем, то нік у клубах чорнага паравознага дыму[м] *(М. Лынькоў)*. 4. Лясы Беларусі дзеляцца на тры віды: хвойныя, шыракалістыя і драбналістыя *(Я. Сіпакоў)*.

● Растлумачце правапіс галосных у першых частках складаных слоў *шыр**а**калісты* і *шыр**о**кавядомы*, *др**а**бналісты* і *др**о**бнамаштабны*.

Складаныя прыметнікі п і ш у ц ц а  п р а з  з л у ч о к, калі:
утвораны:
- ад складаных назоўнікаў, якія пішуцца праз злучок: *унтэр-афіцэрскі* ← *унтэр-афіцэр*, *давыд-гарадоцкі* ← ← *Давыд-Гарадок*;
- ад двух і больш прыметнікаў, якія абазначаюць раўнапраўныя паняцці (паміж імі можна паставіць злучнік ***і***): *хіміка-біялагічны* ← *хімічны* і *біялагічны*, *лірыка-драматычны* ← *лірычны* і *драматычны*;

абазначаюць:
- якасці з дадатковым адценнем колеру, смаку: *цёмна-сіні*, *горка-салёны*;
- напрамкі свету: *паўночна-ўсходні*, *паўднёва-заходні*;
- геаграфічныя назвы з першай часткай *Усходне-*, *Заходне-*, *Паўднёва-*, *Паўночна-*: *Заходне-Сібірская раўніна*, *Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка*.

**334.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.

Самы в..лікі грыбны цуд — б..равік. Цёмна*(?)*вішнёвы, чорна*(?)*карычневы ці светла*(?)*жоўты — у залежнасці ад таго, дзе пас..ліўся князь грыбоў.



Правообладатель Национальный институт образования

Цар п..лявых грыбоў — шампін..ён. Пад шапкай у яго пласціначкі колер.. какавы. На но..цы — тонен..кі па..сок. Гэта астаткі «п..лёнкі», у якую быў захутаны нова*(?)*народжаны шампін..ёнчык.

Кожны хоча назбіраць першых л..сных грыбоў — жоўта*(?)* залатых лісічак. Яны, быццам восен..скае лісце, прапальваюць чэрвен..скую траву. За лісічкамі пойдуць падб..розавікі, а пасля і летнія б..равікі — каласавікі. Так што не спі, грыбнік! *(Паводле Х. Гурыновіча)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс складаных прыметнікаў.

- Растлумачце пастаноўку коскі ў апошнім сказе.



**335.** Складзіце і запішыце невялікі тэкст — мастацкае апісанне грыба сыраежкі з выкарыстаннем складаных прыметнікаў.

**336.** Карыстаючыся схемай, сфармулюйце правіла правапісу складаных прыметнікаў з першымі часткамі *паўднёва-, паўночна-, усходне-, заходне-*.

Што абазначае складаны прыметнік з першай часткай *паўднёва-, паўночна-, усходне-, заходне-*?

- напрамак свету → пішацца праз злучок
- геаграфічную назву → пішацца праз злучок
- не напрамак свету і не геаграфічную назву → пішацца разам

У якасці прыкладаў выкарыстайце наступныя словазлучэнні.

Паўночна*(?)*заходні вецер, паўночна*(?)*еўрапейская культура, паўднёва*(?)*славянскія мовы, Паўднёва*(?)*Кітайскае мора, Усходне*(?)*Еўрапейская раўніна, усходне*(?)*еўрапейская аўчарка.

Запішыце словазлучэнні, раскрываючы дужкі.


Правообладатель Национальный институт образования

**337.** Запішыце сказы, утвараючы ад слоў і словазлучэнняў, што ў дужках, складаныя прыметнікі і дапасоўваючы іх да назоўнікаў. Устаўце, дзе трэба, прапушчаныя літары.

1. Нарэшце за Ждановічамі выехалі на новую *(чатыры паласы)* трасу, і машына пабегла в..сялей *(З. Прыгодзіч)*. 2. Гэты слабы пах струменяць дробныя *(бледны, ружовы)* кветачкі, падобныя да зв..ночкаў *(Х. Гурыновіч)*. 3. Усяго *(старажытныя славяне)* летапісы* і крыніцы дакладна называюць на тэр..ыторыі сучаснай Беларусі 35 г..радоў, якія сён..я вывучаны і даследаваны *(Я. Сіпакоў)*. 4. Ак..ян заварожваў сваёй бяздон..айс, *(празрысты, сіні)* гл..бінёй *(П. Саковіч)*.

## § 55. Правапіс *не (ня)* з прыметнікамі

**338.** Абапіраючыся на прыклады, успомніце правіла напісання ***не (ня)*** з назоўнікамі.

1. Недахоп, незабудка, нянавісць.
2. Непрыяцель — вораг; няволя — прыгнёт.
3. Не ласка, а злосць; не праўда, а хлусня.

Прачытайце прыклады. У якіх выпадках ***не*** пішацца з прыметнікамі разам, а ў якіх — асобна?

| | |
|---|---|
| небагаты чалавек — бедны чалавек | не багаты, ***а*** бедны чалавек |
| невялікая пляцоўка — малая пляцоўка | не вялікая, ***а*** малая пляцоўка |
| нескладанае заданне — простае заданне | не складанае, ***а*** простае заданне |

- Як называюцца пары слоў тыпу *небагаты — бедны*; *багаты — бедны*?

***Не (ня)*** з прыметнікамі пішацца разам:
- калі прыметнік не ўжываецца без ***не (ня)***: *непахісны, няспынны*;
- калі прыметнік можна замяніць сінонімам без прыстаўкі ***не- (ня-)***: *невялікі (малы), няправільны (памылковы)*.



Правообладатель Национальный институт образования